**Кажамякін Г.В. (Мінск, Беларусь)**

## Вобразнасць асобы Максіма Танка: ідэйны і эстэтычны аспекты

Кожны сапраўдны паэт, які піша для чытача, павінен ствараць свой уласны вобраз, што яшчэ цяпер афіцыйна называецца замежным словам *імідж*. Як адзначае Л. Дранько-Майсюк, "паэт – эгаіст у той меры, у якой гэта неабходна, каб з гранічнай шчырасцю заявіць свету пра сябе" [2, с. 5].

Трэба разумець, што эгаіст у гэтым выпадку – не проста сябелюб, які думае толькі пра сябе і не пра іншых. Гаворка ж ідзе пра аўтара, які ў цэнтр сваёй творчасці часта вылучае сваю асобу. Калі паэт не робіць свайго паэтычнага Ego, ён рызыкуе не быць паважаным і ў выніку памерці як паэт. Часам хтосьці з аўтараў нават спрабуе напусціць на сябе пэўную таямнічасць. Выкарыстанне слова *я* ў паэта часта дапамагае такой мэце. Калі ж заўважаецца перавага займенніка *мы*, у чытача можа з'явіцца ўяўленне пра паэта як частку натоўпу. Гэта не спрыяе самавобразу пісьменніка, бо знікае яго эгацэнтрызм. Але і гэтага таксама недастаткова ў некаторых выпадках. Немалое значэнне мае тое, як гучыць імя паэта. Вельмі важным момантам ёсць выбар уласнага псеўданіма. І нам перш за ўсё трэба зразумець, чаму Яўген Іванавіч выбраў такі псеўданім – *Максім Танк*. Вобраз танка з'яўляецца нечаканым, калі чытаеш шматлікія лірычныя творы пісьменніка. Зразумець такое можна, калі задумаемся пра яго сапраўднае прозвішча. Афіцыйна, паводле дакументаў, яно гучала як *Скурко*. Але агульнавядома, што ў беларускай анамастыцы такой формы не існуе. Гэта выглядае нібы ўкраінскі варыянт, дзе, напрыклад, замест прозвішча *Галоўка* можа быць *Галаўко*, замест *Санька – Санько*. Выняткам з правіла можа быць адпаведнае слова ў нашай мове. Напрыклад, прозвішча маці паэта да замужжа – *Хвалько*, што цалкам адпавядае беларускаму назоўніку. Але відавочна, што замест прозвішча *Скурка* калісьці паўстаў як свядомая перакрутка варыянт *Скурко*. У беларусаў такія формы сталі масава пашырацца асабліва ў другой палове XX стагоддзя. Часам гэта было вынікам сарамлівасці чалавека перад нібыта непрыгожым або абразлівым гучаннем прозвішча. Дзеля змянення сэнсу адмыслова мянялі націск. Так з'явіліся формы *Лопух, Петух, Гарачко, Лапато, Лапо*… Нехта дапісваў канчатак, нехта мяняў літару… Зразумела, што для паэта-пачаткоўца, які ўсвядоміў сваё значнае месца ў будучыні беларускай паэзіі, было б прынізліва называцца Скуркам, нават калі існаваў варыянт *Скурко*. Гаворка ідзе пра памяншальную форму назоўніка *скура*. Тут узнікае ўражанне слабасці чалавека, яго неабароненасці. І як жаданае процілеглае ўяўленне паўстаў псеўданім *Максім Танк*. Перш за ўсё заўважым, што добры танк мае ў ідэале моцную браню. Паэт мог сцвярджаць так: "я – не нейкая скурка, а моцная браня, сталь". І гэта адпавядала яго духу тагачаснага змагара за вызваленне Заходняй Беларусі. Чаму менавіта імя *Максім*? Верагодна, гэта адпаведны ваенны вобраз – кулямёт сістэмы *Максім*. Разам з тым тут можна бачыць і гістарычную ідэйную блізкасць да Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага. Сугучныя вобразу гэтага псеўданіма гучаць, напрыклад, такія радкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паэта: “Пакуль не ступілася джала разца / І рукі ад працы не морацца, / Я мушу пакінуць адбітак жыцця / На камні, жалезе і золаце [6, с. 179].

Калі мы хаця б бегла прагледзім том паэзіі Максіма Танка, дык заўважым нават падкрэсленае ўсведамленне, успрыманне навакольнасці, сутнасці рэчаў праз сваё асабістае. І пры гэтым паэт часта ўжывае займеннік *я*, напрыклад: “Я не магу вас песняй цешыць / З абмытых бурамі эстрад… [4, с. 27].

У вершы “Сямейны фотаздымак” (1960) ёсць такія частыя моманты: “Дома чамусьці вяртаюся я /Да маленства ізноў… [5, с. 113], “З сонцам я і сягоння ўстаю…” [5, с. 115].

І так шмат дзе. Гаворачы пра сябе, паэт часам стварае няўпэўненасць у правільнасці разумення, складанасць пазнання. Нярэдка можна сустрэць выразы, падобныя словам: *як жа знайсці мне яе тут, дзе поўна…* (“Венера Мілоская”, 1956), *хто яго ведае – зноў ці змагу напісаць* (“Палёт над Айсбергамі”, 1961), *вось так і не знаю, які колер снегу сапраўдны* (“Колер снегу”, 1966).

Магчыма, у беларусаў па-рознаму ўзнікае разуменне Максіма Танка. Напрыклад, для Анатоля Сыса ён вобразна спалучаўся з персанажам творцы – Люцыянам Таполем. Менавіта так А. Сыс звяртаецца фактычна да самога паэта ў сваім вершы “Маналог «тутэйшага»”, ахвяраваным Максіму Танку: “Люцыян, уяві, ты адзін, / ты застаўся адзін на Славяншчыне, / і нікога няма, паглядзі, / і нічога з Купалавай спадчыны…” [4, с. 201].

Максім Танк тут падаецца як прарок беларускай нацыі, блізкі паводле значэння да Янкі Купалы. Вельмі эмацыйна ў створанай аўтарам гэтага верша паэтычнай абстракцыі паказваецца такое асацыятыўнае ўяўленне народнага паэта Беларусі: “Кайся, кайся за свой жывот, / не забудзься і пра Купалаў, / бо цяпер ты адзін – народ, / быццам храм на шляху вандалаў” [4, с. 203].

Можна сказаць, што А. Сыс выкарыстаў у гэтым выпадку такую ж асацыятыўную вобразнасць, якая была характэрная і для Максіма Танка.

У беларускай паэзіі Максім Танк мог бы стаць паэтам-песеннікам. Перачытваючы яго творы, можна знайсці пераклічку з беларускімі народнымі песнямі. Гэтак, напрыклад, у вершы “Жаўрук” (1947) – нібы спеўнае гучанне, якое добра кладзецца на музыку: “Даручылі жаўруку / Свет будзіць на золаку. / Ну і жаўрук! / Ён падснежнікам лясным / Загадаў біць у званы. / Ну і жаўрук!..” [6, с. 158].

Паэт, як і Ян Чачот, Уладзіслаў Сыракомля, арганічна звязаны з вуснай народнай творчасцю, якая яго выхоўвала з маленства.

Максім Танк унікальны ў беларускай літаратуры як адначасова грамадскі дзеяч, набліжаны да дзяржаўнай улады, і як фактычны заступнік за гнаных той жа ўладай некаторых беларускіх дзеячоў. Мной раней гаварылася пра такі яго чын [3, с. 79]. Можна згадаць і прыклад з лістоў пісьменніка да Л. Геніюш. У адным з іх (за 12 чэрвеня 1967 г.) чытаем: “Ужо з нецярпеннем чакаем выхаду Вашага зборніка. Трэба, каб хлопцы напісалі на яго рэцэнзіі. Мо заўтра буду ў выдавецтве і даведаюся, як абстаяць справы з афармленнем, з тыражом” [1, с. 359].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гаворка ідзе пра зборнік паэзіі Ларысы Геніюш “Невадам з Нёмана”, які выйшаў у 1967 г. На грамадскіх пачатках яго адрэдагаваў У. Караткевіч. Немалая заслуга ў тым, што ён выйшаў, належыць менавіта Максіму Танку. Яму ўдавалася заставацца фактычна пры ўладзе і падтрымліваць сувязь з тымі, каго шмат хто называў здраднікамі, фашыстамі. Такая сувязь была небяспечнай, але не для Максіма Танка. У гэтым балансе – таксама характэрнасць яго асобы. Можна сказаць, што пісьменнік проста пазбягаў крайнасцяў у сваім падыходзе да гэтых пытанняў. Таму як грамадскі дзеяч ён у гісторыі Беларусі – выразны цэнтрыст. Як танк, ён прабіваў сваю пазіцыю, дамагаўся сваёй мэты. Вядома, што значна паспрыяў чыну ягоны аўтарытэт і пасады. Варта нагадаць, што ў 1967–1990 гг. ён – старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі; у 1963–1971 гг. – старшыня Вярхоўнага Савета БССР.

Цікавая гісторыя – стасункі Максіма Танка з А. Сысам, радкі якога цытаваліся вышэй. Нам вядома сёння не вельмі шмат твораў гэтага самабытнага і геніяльнага паэта, разам з тым, іх дастаткова, каб вызначыць яго як класіка нашай літаратуры. Але сваімі незвычайнымі паводзінамі ў часе ўрачыстых пасяджэнняў, канцэртаў, што праводзіліся ў мінскім Доме літаратара, паэт нярэдка выклікаў у свой адрас рэзкія выказванні. Максім Танк ніколі не прамаўляў зняважлівых словаў у адрас А. Сыса, які праз гады ўспамінаў: “Адбывалася пасяджэнне беларускай дыяспары ў канферэнц-зале Дома літаратара. І Максіма Танка пасадзілі. Як ідала. Маўляў, бачыце: нас уважыў. Я ўзяў каструлю з баршчом і падсеў. Кажу: «Максім, пад'еш, можа галодны сядзіш». Ён адказвае: «Я б і рады пад'есці, але ўжо стары, няма апетыту. Дый настрою няма». Пытаюся: «Можа я за цябе піва вып'ю?» «Пі, Толічак, на здароўе. Пакуль малады, бяры ад жыцця ўсё!» Вэрхал падняўся. А неяк прыходжу ў Дом літаратара, і мне перадаюць пакет. У ім – творы Танка з подпісам. Сапраўдны чалавек і паэт быў. Калі памёр, для мяне гэта была трагедыя” [4, с. 402].

Так з усяго сказанага паўстае вобраз адначасова велічнага паэта і сціплага чалавека, патрыёта роднай зямлі, які жыў любоўю да беларускай мовы і свайго краю. Шмат для каго ён таксама застаўся перш за ўсё песняром нарачанскага краю. І таму можна гаварыць пра ўнікальнасць і фенаменальнасць Максіма Танка для беларускай літаратуры ў плане яго іміджу, самавобраза.

Максім Танк не пісаў мастацкай прозы і драматургіі. У спадчыну пакінуў пасля сябе яшчэ дзённікі, лісты… Ёсць нямала пісьменнікаў, якія выявілі сябе адначасова як паэты, празаікі, драматургі, напрыклад, Якуб Колас, Уладзімір Караткевіч… Для беларускай паэзіі існуюць таксама **толькі** паэты. Да іх належыць Максім Танк, які да канца жыцця не адыходзіў ад сваёй паэтычнае творчасці і ствараў вершаваныя замалёўкі таго, што яго цікавіла, радавала, турбавала…

Літаратура

1. Асоба і час : беларускі біяграфічны альманах. – Вып. 3 : Ларыса Геніюш. – Мінск : “Лімарыус”, 2010.
2. Дранько-Майсюк, Л. Тут : вершы, паэмы, эсэ / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 214 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Кажамякін, Г. В. Філасафізм у апошніх паэтычных зборніках Максіма Танка // Г. В. Кажамякін // Восьмыя Танкаўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 верас. 2012 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. Старычонак В. Д. [і інш.]; адк. рэд. Старычонак В. Д. – Мінск, 2012. – С. 78 – 82.
4. Сыс, А. Лён : выбр. творы / А. Сыс. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 436 с.
5. Танк, М. Выбранае : вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 335 с.
6. Танк, М. Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1978–1981. – Т. 1 : Вершы, паэмы. 1930–1945. – 1978. – 526 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ